МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ПАСТАНОВА

# ПОСТАНОВЛЕНИЕ

29.05.2024 № 72

г. Мінск

г. Минск

Аб наданні статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе часткі першай пункта 1 артыкула 93, пункта 4 артыкула 96, часткі першай пункта 6 артыкула 97 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, абзацаў другога і трэцяга падпункта 5.13 і падпункта 5.14 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, рашэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ад 15 мая 2024 г. № 04-01-02/4, Міністэрства культуры ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Надаць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і:

катэгорыю “3” рэшткам касцёла Ўнебаўзяцця Прасвятой Дзевы Марыі 1796 – 1805 гг. у в. Дубрава Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці;

катэгорыю “3” будынку па пр. Незалежнасці, 27А у г. Мінску ў межах гістарычнага аб’ема канца XIX – пачатку XX стагоддзя;

катэгорыю “Б” элементу “Традыцыі свята “Тры каралі” ў аграгарадку Больцішкі Воранаўскага раёна, аграгарадку Ваверка, в. Міхнаўцы, в. Паперня, в. Мейры, в. Чашэйкі, в. Сямейкі, в. Серафіны, в. Мікуты Лідскага раёна, в. Сцігане, аграгарадку Трабы Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці.

2. Унесці ў раздзел 1 “Матэрыяльныя нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь” Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Міністэрства культуры ад 3 студзеня 2023 г. № 1, наступныя змяненні:

2.1. падраздзел “Маладзечансі раён” пасля пазіцыі:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “613Д000304 | Брацкая магіла | 1941–1944 гады | в. Дубрава | 3 | рашэнне Рады 25.02.2003 № 82 | пастанова Савета Міністраў 14.05.2007 № 578” |

Зак. 1335

дапоўніць пазіцыяй:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “613Г000681 | Рэшткі касцёла Ўнебаўзяцця Прасвятой Дзевы Марыі | 1796 – 1805 гады | в. Дубрава | 3 | рашэнне Рады 15.05.2024 № 04-01-02/4 | пастанова Міністэрства культуры 29.05.2024 № 72”; |

2.2. падраздзел ”г. Мінск“ пасля пазіцыі:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “713Г000175 | Адміністрацыйны будынак (былы царкоўна-археалагічны музей) | 1913 год | г. Мінск, пр. Незалежнасці, 26 | 3 | рашэнне Рады 07.08.2001 № 66 | пастанова Савета Міністраў 14.05.2007 № 578 |

дапоўніць пазіцыяй:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “712Г000386 | Будынак (у межах гістарычнага аб’ёму) | канец XIX – пачатак XX стагоддзя | г. Мінск, пр. Незалежнасці, 27А | 3 | рашэнне Рады 15.05.2024 № 04-01-02/4 | пастанова Міністэрства культуры 29.05.2024 № 72”; |

3. Раздзел 3 “Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь” Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Міністэрства культуры ад 3 студзеня 2023 г. № 1, пасля пазіцыі:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “43АК000096 | Творчасць майстра па вырабу габеленаў у традыцыях падвойнага і пераборнага аднабаковага ткацтва Алены Шунейкі | – | г. Гродна | А | рашэнне Рады 20.04.2012 № 192 | пастанова Савета Міністраў 02.08.2016 № 607” |

дапоўніць пазіцыяй:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 43БЛ000180 | Традыцыі свята “Тры каралі” | - | аграгарадок Больцішкі Воранаўскага раёна, аграгарадок Ваверка, в. Міхнаўцы, в. Паперня, в. Мейры, в. Чашэйкі, в. Сямейкі, в. Серафіны, в. Мікуты Лідскага раёна, в. Сцігане, аграгарадок Трабы Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці | Б | рашэнне Рады 15.05.2024 № 04-01-02/4 | пастанова Міністэрства культуры 29.05.2024 № 72”. |

4. Гэта пастанова ўступае ў сілу пасля яе падпісання.

Міністр А.М.Маркевіч